Бацькаўшчына

WHITERUTHENIAN WEEKLY „THE FATHERLAND“

Цана гэтага нумару 20 н. фэн.

№ 25 (28) 8 жніевеня 1948 г. Год выданьня 2

СЬВЕТ У ПАЛІТЫЧНЫМ НЕРАЦЕ

АГЛЯД СУСЬВЕТНАЕ ПАЛІТЫКІ

Агульнае палажэньне сусьветнае палітыкі апошнімі месяцамі й асабліва тыднямі як найлепш можа характарызавацца ведамай нашай народнай прыказкай:«Трапіў у нерат — ні назад, ні наперад».

БЭРЛІН — НЯМЕЧЧЫНА

Найтужэй завязаўся гэты сусьветна-палітычны нерат у Бэрліне. Першая мена нотамі між Захадам (ЗША, Вялікабрытанія, Францыя) і саветамі ў бэрлінскай справе ясна паказала: Захад гатовы да урэгуляваньня справы перамовамі пры канечнай умове зьняцьця савецкае блёкады Бэрліну, саветы таксама гатовыя да перамоваў пры канечнай умове — бяз усякіх папярэдніх умоваў... Дагэтуль ня знойдзены выхад з такога «нерату» «ні назад, ні наперад». З боку Захаду разважаліся розныя крокі: пасланьне новае ноты, зварот да Задзіночаных Нацыяў, навет узброенае прабіцьцё сухаземнае дарогі на Бэрлін. Тымчасам спыніліся на даручэньні амэрыканскаму, брытанскаму й францускаму паслом у Маскве зрабіць супольны вусны дэмарш Молатаву. Але як на тое — Молатава няма ў Маскве, ён хіба ў вадпачынку, пра асобу ягонага заступніка нічога няведама — і дэмарш тымчасам не праведзены... Некаторыя амэрыканскія газэты суцяшаюць сябе, што яшчэ няма куды сьпяшацца...

Тымчасам паранейшаму заходні Бэрлін забеспячаецца самалётамі праз «паветраны мост». Дасягнута перавожаньне такім спосабам да 2 000 тонаў харчоў і 1 000 тонаў вугальля штодня. Саветы выказалі гатовасьць забясьпечыць і заходні Бэрлін з магазынаў свайго сэктару на іхную ўсходня-нямецкую валюту, дакляруючы на гэтую мэту аж 100 000 тонаў збожжа й іншых харчоў... Захад ставіцца да гэтага скептычна, справядліва бачачы тут толькі савецкі прапагандавы манэўр ,бо тымчасам у сваім сэктары Саветы скарачаюць удвая нормы хлеба...

Саветы спрабавалі сваймі паветранымі манэўрамі перашкаджаць паветранаму забясьпечаньню Бэрліну, але дармо. Захад, як адплатныя мерапрыёмствы, спыніў пастачаньне саветам рэпарацыяў з Заходняе Нямеччыны, пачаў праводзіць эканамічную блёкаду ўсяе савецкае зоны Нямеччыны. Бэрлінскі магістрат звольніў начальніка паліцыі Маркграфа, савецка-камуністычнага агента, за цэлы рад парушэньняў законнасьці, перадаўшы выконваньне ягоных функцыяў заступніку. Савецкі камандант Бэрліну Коцікаў звольніў гэнага заступніка не прызнаючы звальненьня Маркграфа. У выніку выглядае падзел адзінае дасюль бэрлінскае паліцыі на заходнюю і ўсходнюю...

Саветы выпусьцілі ў сваёй зоне Нямеччыны свае «нямецкія маркі», якія жыхарства празвала «чырвонцамі» й абменьваюць на іх старыя грошы з наклеенымі на іх кагадзе маркамі.

Прэм'ер-міністры Заходняе Нямеччыны адкінулі былі прынятыя ў Лёндане прапановы заходніх аліянтаў што да стварэньня заходня-нямецкага адзінства, але за другім разам перадумалі й пагадзіліся зь невялікімі засьцярогамі.

У францускай зоне Нямеччыны, у Людвігсгафэне, адбыўся велізарны выбух на вялікім хэмічным прадпрыёмсьцьве. Адных устаноўленых забітых 124 чалавекі, шукаюцца яшчэ 250... Прычыны тымчасам нявыяўленыя.

ЮГАСЛАВІЯ

Паранейшаму Белград займае пачэснае месца ў сусьветнай паліцыі, адразу-ж бадай пасьля Бэрліну. Прайшоў 5-ты зьезд камуністычнае партыі Югаславіі, які выказаў поўнае падтрыманьне й «энтузіязм» у дачыненьні да Тыто. Тыто зноў абраны за старшыню партыі, таксама абраны на адказныя становішчы й іншыя ягоныя паплечнікі, асуджаныя камінформам. Зьезд ня прызнаў выключэньня Югаслаўскае кампартыі з камінформу, пацьвердзіў ранейшае апраўдальнае становішча ў дачыненьні да ягоных абвінавачаньняў, пастанавіў дамагацца перагляду справы, але стоячы на ранейшым становішчы, як на адзінаправільным. Ізноў падчыркненая вернасьць Югаславіі Сталіну, СССР і «народным дэмакратыям» (г. зн. сатэлітам СССР). Савецкі друк, асабліва «Праўда», поўныя напалкаў на зьезд, які быццам-бы йшоў пад тэрорам, патрабаваў «аховы штыхоў», чаго, быццам-бы, у СССР не патрабуецца...

ЗША адблёкавалі югаслаўскае золата, па прыняцьці Югаславіяй умовы адшкадаваньня ўсіх амэрыканскіх стратаў. Тыто заявіў,што ён за шырокія эканамічныя сувязі з Захадам, але без палітычных умоваў.

Турэцкія газэты падаюць весткі аб канцэнтрацыі савецкіх войскаў на межах Югаславіі.

ЗША

Амэрыка рыхтуецца да чародных выбараў прэзыдэнта ЗША, што маюць быць увосень. Кіраўнічыя партыі выставілі сваіх кандыдатаў. Рэспубліканская партыя, якая цяпер мае бальшыню ў кангрэсе, выставіла губарнатара штату Нью-Ёрк Д'юі, дэмакратычная партыя —цяперашняга прэзыдэнта Трумана. «Трэйцяя партыя» саветафілаў, назваўшыся цяпер «прагрэсыўнай партыяй», выставіла свайго славутага Генры Ўолеса, дамагаецца згоды з Расеяй, скасаваньня дактрыны Трумана й пляну Маршала. Ад дэмакратычнае партыі адшчапіліся дэмакраты паўдзённых штатаў, якіх завуць «чацьвертай партыяй», «партыяй Джэфэрсона» або «дыксыкратамі». Іхным кандыдатам выстаўлены Труман. Найбольш шансаў мае хіба рэспубліканскі кандыдат Д'юі, хоць і шансы Трумана, навет пры адшчапленьні паўдзённых дэмакратаў, вельмі высокія. Саветафіл Ўолес хіба мае найменшыя шансы, хоць і адцягне на сябе частку галасоў, якія пайшлі-б на дэмакратаў.

Прэзыдэнт Труман склікаў на надзвычайную сэсію кангрэс, паставіўшы, між іншага, на парадак абрадаў справу пашырэньня прынятага ўжо закону аб дапушчэньні ДП у ЗША (з 205 да 400 тысячаў на працягу 4 год, і то звыш нармальных эміграцыйных квотаў). Таксама мае разглядацца й бэрлінская справа.

Раптоўным налётам паліцыі заарыштаваная ўся камуністычная верхавінка ЗША (12 асобаў на чале із старшынём партыі Форстэрам). Арыштаваныя абвінавачваюцца ў падбураньні да ўзброенага гаспадарстваўскага перавароту, пагражае ім турма да 10 год і да 10 000 даляраў грашовае кары.

Сёлета ў ЗША проста нябывалы ўраджай.

ФРАНЦЫЯ

Францыя перажыла ўрадавы крызіс. Урад Шумана быў звалены сацыялістымі на галасаваньні выдаткаў на вайсковыя справы, што выдаваліся сацыялістым, камуністым і некаторым іншым завялікімі. Новы ўрад сфармаваў радыкал-сацыяліст Андрэ Мары, адзін зь ягоных заступнікаў — сацыяліст Блюм. За міністра замежных справаў — папярэдні прэм'ер-міністар Шуман, дасюлешні і ўжо ад даўжэйшага часу міністар замежных справаў Бідо не ўвайшоў зусім у ўрад.

Не выглядае, каб новы ўрад быў вельмі трывалым.

ФІНЛЯНДЫЯ

І Фінляндыя пасьля выбараў у парлямэнт, у якіх пяршынство здабыла аграрная партыя, а камуністыя шмат страцілі, перажыла ўжо ўрадавы крызіс. Цяпер сацыял-дэмакрат Фагэргольм сфармаваў чыста сацыял-дэмакратычны ўрад, ня ўзяўшы ані камуністых (якія патрабавалі сабе, між іншага, найважнейшых міністэрстваў замежных і нутраных справаў), ані навет аграрыяў. З увагі на націск саветаў, нельга думаць, каб гэткі антыкамуністычны ўрад у Фінляндыі быў вельмі трывалым.

ІТАЛІЯ

у Італіі камуністычны правадыр Тальяты перажыў замах на жыцьцё, у якім атрымаў аж 4 кулі, але ўжо выкачаўся й зноў бярэцца за сваю разбуральную працу. Сталін пасылаў яму лекароў, пажурыў італьянскіх камуністых, што блага ахоўвалі свайго правадыра. і тыя цяпер заяўляюць, што ў будучыні будуць пільнейшымі й самі будуць нападаць першымі, бо напад — найлепшая абарона. Камуністыя спрабавалі выкарыстаць замах, правялі забастоўкі, даходзіла навет да партызанкі, якую ўраду даводзілася ліквідаваць аж цяжкой зброяй.

І ў Японіі адбыўся замах на камуністычнага правадыра Такуда. Паяпонску зацяты, ён не перапыніў свае прамовы й гаварыў яшчэ 20 часінаў, сьцякаючы крывёю.

ПАЛЕСТЫНА

У Палестыне йзноў устанавілася замір'е, пасьля таго, як Задзіночаныя Нацыі прыгразілі ўжыцьцём санкцыяў. Замір'е аднак часта парушаецца. Жыдоўская тэрарыстычная арганізацыя «Іргун Цвай Леўмі» адмовіла ў прызнаньні ўраду Ізраэлю, і змагаецца цяпер і з урадам і з Арабамі, змушаючы і ўрад да такога-ж змаганьня на два бакі.

ГРЭЦЫЯ

У Грэцыі далей удала разгортваецца генэральны наступ на «партызанаў», у якім занята больш за палавіну грэцкае ўрадавае арміі. Правадыр партызанаў «генэрал» Маркас ізноў запрасіўся міру, ужо выстаўляючы лагаднейшыя ўмовы. Урад адкідае ўсе гэтыя просьбы, вымагаючы бязумоўнае капітуляцыі «партызанаў». Аднак, канца змаганьня яшчэ ня відаць.

АПОШНІМ ЧАСАМ

* Сталін прыняў ткі паслоў ЗША, Вялікабрытаніі й Францыі ды меў зь імі двугадзінную гутарку. Пры гутарцы быў і Молатаў, які дзеля гэтага перапыніў свой адпачынак. Адразу пасьля гэтага паслы мелі двугадзінную гутарку міжсобку, а тады гадзіну гутарылі амэрыканскі й брытанскі паслы ўдвух. Пра зьмест і характар гутарак тымчасам нічога не падаецца.

* У Белградзе йдзе ўжо канфэрэнцыя ў справе Дунаю, на якой савецкі прадстаўнік Вышынскі робіць рэзкія выпады супраць заходніх гаспадарстваў.

* Прэзыдэнт Вугоршчыны Тыльды адыйшоў, на ягонае месца абраны камуністы Сакашытс.

* Прэзыдэнт Труман вымагае ад кангрэсу 2 міліёны даляраў на прысьпешаньне эміграцыі ДП у ЗША.

* На перавожаньне ДП у ЗША будуць выкарыстоўвацца амэрыканскія транспартавыя самалёты, 6 зь іх ужо мае пачаць такое перавожаньне яшчэ ў гэтым **месяцы.**

АД РЭДАКЦЫІ

Перапынак у выхадзе нашае газэты,аб магчымасьці якога мы папераджалі ў сваім апошнім нумары, зацягнуўся ледзь не на месяц. Фінансавыя абставіны змусілі нас адмовіцца ад чужога наборшчыка, занадта дарагога. Ад гэтага нумару газэты набірае свой работнік, але пачатковец, ад чаго на першых часох будзе залежаць паменшаны памер нумароў газэты. Задарагая для нас і цяперашняя друкарня (куды даражэйшая за іншыя, у якіх друкуюцца газэты ДП), і з гэтага таксама шукаецца, а магчыма неўзабаве будзе знойдзены выхад. Усё гэта не дазваляе нам тымчасам запэўніць рэгулярнасьць і бесьперабойнасьць выданьня газэты. Паранейшаму зварачаемся да добразычлівых чытачоў з просьбаю не пакідаць нас сваей дапамогай чым мага і як мага, сьведамыя аднак таго, што малая колькаснасьць нашае нацыянальнае групы ў Нямеччыне — непараўнальна меншая супраць Балтаў, Палякоў, Украінцаў, Расейцаў і інш. ня можа забясьпечыць нам таго падтрыманьня, якое маюць іншыя газэты ДП.

ПАМАЖЭЦЕ СТУДЭНЦТВУ!

Цэнтраля Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў, пакліканая да жыцьця яшчэ ў 1946 годзе, прадаўжальніца працы ЦБСА, заснаванай у 1926 г. у Празе, гуртуе сяньня ў сваіх радох усе беларускія акадэміцкія арганізацыі на эміграцыі. ЦБСА паставіла сабе за мэту, каб як найбольшая колькасьць моладзі здолела вучыцца ў вышэйшых установах і гэтым самым магла ўзбагаціць наш народ сьвежымі кадрамі сьведамай нацыянальнай інтэлігенцыі. На сяньняшні дзень налічваецца наступная колькасьць студэнтаў: у Нямеччыне — 92, Ангельшчыне — 4, Францыі — 6, Бэльгіі — 1 і ў Італіі — 1. Пры гэтым трэба зацеміць, што ўваднэй толькі Ангельшчыне налічваецца больш за 50 Беларусаў — абсальвэнтаў сярэдніх школаў, кандыдатаў на ўнівэрсытэты. Сярод іх і «дванаццатка», ведамая нашаму грамадзтву сваім высокім нацыянальным і інтэлектуальным узроўнем. А колькі-ж падобных «дванаццатак» капае сяньня чужое вугальле, марнуючы свае фізычныя й духовыя сілы. Колькім-жа зь іх унівэсытэт застаецца надалей неадсягальным лятуценьнем, як гэта было некалі на акупаванай Беларусі. А тым-жа самым часам былыя нашыя акупанты тысячамі здабываюць асьвету й гэтым рыхтуюць маладыя кадры для будучага дзяржаўнага будаўніцтва.

Што-ж стаіць на перашкодзе нашай моладзі? Просты адказ — нястача матар'яльная. І вось аднэй з асноўных мэтаў ЦБСА было змаганьне з гэнай мачыхай нашае акадэміцкае моладзі. Летась быў заснаваны пры ЦБСА Студэнцкі Стыпэдыяльны Фонд, які зьвярнуўся да беларускага грамадзтва з заклікам аб матар'яльнай дапамозе нашаму студэнцтву. Дармо, што нашае грамадзтва само беднае, — яно не засталося глухім на наш кліч. На працягу аднаго году ад нашых асяродкаў у Нямеччыне ў касу ССФ прыплыло блізу 50 000 марак грашыма й натураю. Гэта сьветчыць аб вялікім зразуменьні нашага грамадзтва да справы студэнцкай і даець зарукy, што й надалей беларуская эміграцыя не адмовіць нам свае апекі й дапамогі.

Грамадзяне! У сувязі з грашовай рэформай у Нямеччыне вытварылася блізу бязвыходная сытуацыя для беларускага студэнцтва. Выменены грошай з натугаю стае, каб закончыць бягучы сэмэстар. Як-жа выглядае сытуацыя на будучы сэмэстар? На гэта дайце, дарагія суродзічы, Вы нам адказ.

Будучыня беларускага студэнцтва ў Нямеччыне залежыць вылучна ад Вас, дарагія грамадзяне! Бяз Вашае дапамогі з пачаткам наступнага сэмэстру,у кастрычніку сёлета, колькасьць нашых студэнтаў у Нямеччыне зрэдукуецца блізу да нуля.

Грамадзяне! Ці-ж можна да гэтага дапусьціць? Ці ня будзе гэта злачынствам перад нашай будучыняй? Палова нашых студэнтаў стаіць перад канчаткам вучэньня. Бальшыні зь іх не стае году, найбольш двух, да заканчэньня студыяў. Урад ЦБСА і Ўправа ССФ добра ведаюць, што ў сувязі з грашовай рэформай нашае грамадзтва апынілася ў яшчэ цяжэйшых матар'яльных абставінах, чымся гэта было раней, але далёка ня так крытычных, як студэнцтва. Мы верым, што Вы гэта зразумееце й зварачаемся да Вас з гарачым заклікам — **памажэце беларускаму студэнцтву ў найцяжэйшых ягоных часінах.** Складайце ахвяры на Студэнцкі Стыпэндыяльны фонд пры ЦБСА ! Кажная Ваша ахвяра — гэта новы прамень надзеі нашаму студэнцтву. Кажная ахвяра — гэта довад зразуменьня патрэбы стварэньня свае нацыянальнае інтэлігенцыі, гэта довад нацыянальнае сьведамасьці. Беларускае студэнцтва патрапіць гэта ацаніць і заплаціць Вам за гэта сваёй аддананай працай для Беларускага Народу й Бацькаўшчыны.

Ахвяры просім высылаць: зь беларускіх асяродкаў у Нямеччыне на адрыс ЦБСА: Marburg/ Lahn, Schwanallee 32, з зазначэньнем: ахвяра на ССФ псы ЦБСА; з асяродкаў за межамі Нямеччыны на адрыс Філіі ССФ пры Беларускім Хрысьціянскім Акадэміцкім Аб'еднаньні ў Ангельшчыне: Mr. Sipovič Čestaŭ, London E 2, The Oval Hockney Road. Зазначаем, што ахвяры высланыя на філію ССФ, будуць скарыстаныя на дапамогу студэнтам за межамі Нямеччыны.

Дык усе на дапамогу беларускаму студэнцтву! Зложы ахвяру сам і пераканай другога ў канечнасьці!

Урад Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў

ПА КУТКОХ ЭМІГРАЦЫІ

НОВЫ ВЫБРЫК СЬЦЯГАТАПТАЛЬНІКАЎ

Пасьля ведамае гісторыі з таптаньнем сьцягоў міхельсдорфскія зарубежнікі надумаліся праславіцца новым выбрыкам. Інсьпіраваны імі бацькаўскі камітэт гімназіі ймя Янкі Купалы, нячувана перавышаючы свае паўнамоцтвы, абвесьціў раптам аб звальненьні дырэктара гімназіі й бальшыні настаўнікаў ды «прызначыў»новы склад (у бальшыні зь людзей навет безь сярэдняе асьветы). Справа, зразумела, пайшла ў ІРО. Апошняе таксама пачало разьвязваць яе вельмі арыгінальна й супэрдэмакратычна — галасаваньнем бацькоў(спосаб, практыкаваны ў «найдэмакратычнейшым» СССР яшчэ за часамі г. зв. «ваеннага камунізму», але ад тых часоў навет і там адкінуты). На шчасьце аднак бальшыня бацькоў аказалася разважнейшай і за зарубежнікаў «рэфарматараў», і за іхных супэрдэмакратычных апякуноў: у патаемным галасаваньні пад наглядам урадаўцаў ІРО пераважнай бальшынёй (41 супраць 26) пастаноўлена захаваць гімназію поўнасьцяй у ранейшым складзе. Гэтак тымчасам новы выбрык зарубежнікаў не дайшоў да выніку (хоць яшчэ няма ведама, ці спыніцца яны на гэтым).

Лаўры чарнасоценцаў, відаць, не даюць ткі спакойна спаць міхэльсдорфскім малойчыкам. Бо пры гэтым так і ўспамінаецца ведамы герой Салтыкова-Шчэдрына Угрум-Бурчэеў (зь «Гісторыі гораду Глупава»), які «въехал в город, сжег гимназию и упразднил науки». Адно што яшчэ сьцягоў не таптаў...

Сусед.

НОВАЯ СКАЎЦКАЯ АДЗІНКА

У першай палавіне ліпеня сёлета Галоўнае Кіравецтва Беларускіх Скаутаў зарганізавала новыя скаўцкія адзінкі ў Маервіку каля Фленсбургу. Пачалі ўжо актыўныя заняткі зьвяз імя Кастуся Каліноўскага й Грамада Адважных Ваўчанятаў. Неўзабаве адбудзецца першая скаўцкая ўрачыстасьць моладзі — складаньне прырачэньня, да чаго штодня рыхтуецца моладзь. Гэтымі дзьвюма адзінкамі наш скаўтынг павялічыў свае рады маладых змагароў за вялікія скаўцкія й нашыя нацыянальныя ідэалы. Пажадаем скаўцкай арганізацыі й ейным маладым сябром як найлепшых удачаў на славу нашае Бацькаўшчыны!

ПАПРАЎКА

У № 21 «Бацькаўшчыны» ў карэспандэнцыі аб другім зьезьдзе «Аб'яднаньня Беларускіх Лекараў на Чужыне» ў Марбургу сп. Я Лаўрыновіч падаў памылкова прозьвішча сакратара. На зьезьдзе за сакратара «Аб'яднаньня» быў выбраны ня др. Мілянцэвіч, а др. Анатоль Бразоўскі.

ДАРОГУ ЗА АКІЯН І БЕЛАРУСАМ

27-га ліпеня сёлета заступнік Старшыні Беларускага Нацыянальнага Камітэту-Цэнтральнага Прадстаўніцтва й Старшыня Камітэту на Амэрыканскую зону наведалі Галоўную Гасподу ІРО ў Бад-Кісынгене й злажылі мэмар'ял аўстралійскай місіі ў справе нашых пажаданьняў на выезд у Аўстралію. Другі мэмар'ял скіраваны ў Вашынгтон (з копіяй у Галоўную Гасподу ІРО ў Бад-Кісынгене) з пажаданьнямі й просьбамі ў справе выезду беларускіх ДП у Амэрыку.

ДА ЭМІГРАЦЫІ Ў АМЭРЫКУ

ІРО дало агульныя выясьненьні што да эміграцыі ў Амэрыку.

Паводля выясьненьняў, у ЗША будуць прынятыя ДП, што адпавядаюць наступным умовам:

1) пражываньне ў заходніх зонах Нямеччыны, Аўстрыі, а таксама ў заходніх сэктарах Бэрліну да 22 сьнежня 1945 г. і бытцьцё на гэтых-жа тэрыторыях яшчэ 1 студзеня 1948 г.

2) адпаведнасьць іміграцыйным вымаганьням што да здароўя прафесійных кваліфікацыяў, запэўненасьць працы й памешканьня ў ЗША

3) адпаведнасьць сем'яў умовам здароўя й іншым агульным умовам

4) на 40 % усіх месцаў маюць права перамяшчэнцы з балтыцкіх краёў і з-за лініі Керзона

5) пяршынство маюць земляробы й земляробскія працаўнікі, далей будаўнічыя працаўнікі, тэкстыльныя спэцыялістыя, а таксама яшчэ некаторыя групы спэцыялістых, якія будуць устаноўлены пасьля; прывілеямі карыстаюцца таксама сваякі (да 3-е ступені) амэрыканскіх грамадзянаў і асобаў, правамоцна аселых у Амэрыцы

6) далейшае пяршынство належыцца былым вайсковым, што змагаліся па баку ЗША; лягерныя жыхары маюць пяршынство перад тымі, што жывуць прыватна — дапушчэньне апошніх будзе залежыць ад пастановы амэрыканскіх іміграцыйных прадстаўнікоў

7) Не дапушчаюцца прыхільнікі камунізму або фашызму, маральнасьць кандыдатаў на выезд будзе падрабязна дасьледавацца

8) справа выезду «Фольксдойчам» будзе ўрэгулявана адмысловым распараджэньнем.

Зацемка. Асобы, якія пакінулі лягер пасьля 1 студзеня 1948 г., будуць разглядацца, як асобы. якія былі ў гэтым часе ў лягеры. Дакладныя дадзеныя што да далейшых спэцыяльнасьцяў будуць апублікаваныя асобна.

ЦАРКОЎНЫЯ СПРАВЫ

ПАСТАНОВА ЧАСОВАГА КІРАВЕЦТВА БЕЛАРУСКАЕ ПРАВАСЛАЎНАЕ АЎТАКЕФАЛЬНАЕ ЦАРКВЫ

Справа: «Пасланьне» Мітрапаліта Панцялеймана й «Выясьненьні з канцылярыі Беларускай Мітраполіі» Тырсгайм, 8. 7. 48.

Пастанова: ЗАКЛІК ДА ЎСІХ ПРАВАСЛАЎНЫХ БЕЛАРУСАЎ І ЎСЯГО БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДЗТВА.

Часовае Кіравецтва Беларускае Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы гэтым заклікае ўсіх беларускіх вернікаў з пакорай прыняць выпыт Божы ў постаці гэтых двух пісаньняў («Пасланьне» й «Выясьненьні») і з тым большай пэўнасьцяй трываць на адзінаправільным шляху чыстае незалежнасьці Беларускае Праваслаўнае Царквы, роўнаапостальскага носьбіта праваслаўнае веры ў беларускім народзе. Заклікаем устрымацца ад усякіх адказаў і адпісваньня. Усемагутны Бог бачыць і, калі трэба будзе, Сам адкажа й напіша сваё магутнае МАНЭ ТЭКЭЛ ФАРЭС. Верце й малецеся аб дараваньні вінаў тым, што нападаюць на вас. Памятайце словы Хрыстовы: **Любі бліжняга твайго,** малецеся малітвай Господавай «Войча наш»: **адпусьці даўгі нашыя, як і мы адпушчаем вінаватым нам.** Прыпомніце з запаветаў Балажэнства: **БАЛАЖЭННЫЯ, КАЛІ ПАНОСЯЦЬ ВАМ І СКАЖУЦЬ УСЯКІ ГУК ДРЭННЫ НА ВАС ДЗЕЛЯ МЯНЕ. РАДУЙЦЕСЯ Й ВЕСЯЛЕЦЕСЯ, УЗНАГАРОДА БО ВАШАЯ ВЯЛІКАЯ НА НЯБЁСАХ.**

ЧАСОВАЕ КІРАВЕЦТВА БПАЦ.

АД ЧАСОВАГА КІРАВЕЦТВА БПА ЦАРКВЫ

Падаецца да ведама ўсіх айцоў-сьвятароў БПА Царквы **абавязваючае памінаньне:** «Сьвяцейшыя Праваслаўныя Васточныя Патрыярхі і Праасьвяшчэньнейшага Епіскапа Сергія і ўсе Праваслаўныя Мітрапаліты, Архіепіскапы й Епіскапы аўтакефальных цэркваў».

Часовае Кіравецтва БПАЦ гэтым выясьняе **ўсім духоўнікам, што прыслалі сваё жаданьне служэньня й належаньня да Беларускае Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы:** а) усе духоўнікі, што падалі заявы ў ЧК БПАЦ, узятыя на лік, б) сьвятары, што падлягаюць іншым аўтакефальным цэрквам, да часу атрыманьня адпускное ад сваіх цэркваў ня могуць быць прынятыя на выконваньне сьвятарскіх абавязкаў у БПАЦ.Выясьняем, што гэтак зв. Расейская Зарубежная Царква ня мае кананічнасьці аўтакефальнае царквы й таму адпускное не патрабуецца. Не вымагаецца адпускное й ад Расейскай Аўтакефальнай Царквы дзеля тэхнічнае немагчымасьці атрымаць такую з СССР, в) просьба да ўсіх айцоў-настаяцеляў рыхтаваць кандыдатаў у духавенства й прадстаўляць Часоваму Кіравецтву БПАЦ, г) усе беларускія духоўнікі, што згубілі дакумэнты й царкоўна-служэбныя рэчы, могуць устанавіць і атрымаць такія ў ЧК БПАЦ.

У ЧАСОВЫМ КІРАВЕЦТВЕ БЕЛАРУСКАЕ ПРАВАСЛАЎНАЕ АЎТАКЕФАЛЬНАЕ ЦАРКВЫ

Сьвятарскія курсы. Дзеля грашовых цяжкасьцяў і надасланьня вялікага ліку заяваў ад кандыдатаў на курс сьвятароў — псаломшчыкаў, паведамляем, што пачатыя ходаньні аб адчыненьні наступных курсаў у амэрыканскай і ангельскай зонах. Таму ўсіх далёкіх кандыдатаў просім пачакаць, а тымчасам вучыцца ў дома чытаць па царкоўна-славянску й вывучаць царкоўны абыход. Гэта палегчыць барджэй канчыць курс і дасягнуць пажаданае ступені. Кажны духаўнік павінен знаць «служэбнік», які можна атрымаць у кажным царкоўна-кніжным выдавецтве. Веды дагматычныя, гісторыя Царквы й г. д будуць выкладацца на курсах, як і будуць выданыя адмысловымі запіскамі для самавукаў.

Жыровіцкае Брацтва. Надовечы Уладыка Сергі зацьвердзіў Брацтва Жыровіцкага манастыра й вызначыў прат. Сьцяпана Войтанку на апякуна й старшынёю Брацтва. Усе справы Жыровіцкага Брацтва вядзе братчык Аляксандра Асіпчык (13a, Windischbergerdorf bei Cham, Weißruthen. DP-Lager.) Пажаданае засноўваньне аддзелаў Брацтва пры беларускіх прыходах на эміграцыі.

Выдавецтва царкоўнае літаратуры. У сувязі з надыходжаньнем прапановаў на выдаваньне царкоўных і рэлігійных кнігаў, Кіравецтва БПА Царквы паведамляе, што ў блізкім часе будзе створана пры Кіравецтве Царкоўна-Кніжны Беларускі Праваслаўны Нагляд, які будзе пераглядаць рэлігійныя праваслаўныя выдавецтвы й прадстаўляць да дазволу Галаве БПА Царквы.

Узнагароды сьвятароў. Надовечы Уладыка Сергі ўзнагародзіў чароднымі ўзнагародамі сьвятароў Хведара Данілюка й Сьцяпана Войтанку.

ШУКАЮЦЬ...

Мужа **Барыса Ліхача,** нар. 1915 г. у Жыровіцах, Слонімскага пав. — Агата Ліхач. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Жонку й сына — Антановіч Антон. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Салохіна Рамана,нар. 15. 7. 1923, у часе вайны жыў у Oberschlesien-Салохін Міхал. Весткі на адрыс: Kufstein Lager IRO in Tirol (Österreich).

Брата **Грыцука Мікалая,** у часе вайны жыў: Hockenheim Baden, Luisenstraße 44, Fuchs zum Fuchsbau Гуз Павал з маткаю Варвараю й братам Шурам (Аўстрыя). Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Знаёмых з Палескае акругі, Васілевіцкага раёну — Рагаўцоў І. Ф. з лугасу «Ведрычы». Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Брата **Шаграя Мікалая,** нар. 1926, Магілеўскай акругі — сястра Марыя Шпакоўская. Весткі на адрыс: Passau, DP-Lager Mayerhof-Kaserne.

Адамовічаў Флёрку (нар. 1924 г.) і **Антося** (нар. 1926) з Бабінкі, Бярэзінскага раёну. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Маці **Дуброўскую** Аляксандру й сёстраў Люсю й Вольгу — Сяргей. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Караленку Міколу з жонкай Ядзьвігай і дачушкай Славай — кумы й сябры. Усіх, хто ведаў-бы пра іхнае месцазнаходжаньне — просьба паведаміць на адрыс рэдакцыі «Бацькаўшчыны».

З БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

З «ОБШЧЭПАНЯТНАЙ» УСЮДЫ ЛЁГКА...

Амэрыканская расейская газэта «Новое Русское Слово» у нумары ад 15. 4. 1948, у зацемцы свайго собскага карэспандэнта Лява Пятрова з Канады падае, між іншага, цікавы для нас мамэнт, які выплыў на адным з «растлумачальных» дакладаў савецкіх прадстаўнікоў у Канадзе, прысьвечаным агітацыі за прыйманьне савецкага грамадзянства й рэпатрыяцыю ў СССР.

Карэспандэнт, між іншага, паставіў такое пытаньне (падаём даслоўна ў ягоным фармуляваньні):

«Бальшыня тут зыбраных Беларусы. Шмат зь іх хацелі-б зьвярнуцца на Бацькаўшчыну, у Беларускую рэспубліку, але ўсе мы гаворым, чытаем, пішам і вучымся парасейску. Адзін час у Амэрыцы й Канадзе спрабавалі выдаваць газэту ў беларускай мове, але, як відаць, самыя Беларусы ад гэтага адмовіліся (? Рэд.), і цяпер тут школаў і друку ў беларускай мове няма. Ці ня будзе гэта памылка, ці ня трапяць усе, што вяртаюцца на Бацькаўшчыну, у **Беларусь бязь веданьня** свае роднае мовы й мовы рэспублікі?»

Адказ быў даслоўна наступны:

«Чалавеку, які ведае толькі беларускую мову й выпадкам апыніцца ў Украінскай Рэспубліцы, даводзіцца дазнаваць шмат цяжкасьцяў, у цэнтральнай Расеі ён стрэне іх яшчэ больш, а калі трапіць на Каўказ ды ў іншыя савецкія рэспублікі, дык напэўна там загубіцца. Зусім іншая рэч з расейскай моваю. Зь ёй усюды лёгка...».

ПОЛЬСКА-ПРАВАСЛАЎНЫ БУМЭРАНГ

26. 6. сёлета радыё Варшава падало, што прадстаўнікі праваслаўнага духавенства зь Беластоку наведалі Маскоўскага Патрыярха й прасілі яго камуністычную сьвятасьць дазволіць узнавіць дзеяньне Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Патрыярх Маскоўскі паставіўся да гэтае справы вельмі прыхільна, сьцьвярджаючы факт існаваньня й прызнаньня Польскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы. Яго камуністычная эксцэленцыя абяцаў неўзабаве высьвяціць новых епіскапаў для Беластоку і Брэславу.

Такім парадкам, пачатая польскімі шавіністымі палёнізацыя Беларусаў і Ўкраінцаў праз Праваслаўную Царкву, як бумэранг, варочаецца назад і ўдарае ў інтарэсы Польшчы. Гэтым разам будзе служыць камуністычнай Маскве дзеля разьяданьня грамадзка-рэлігійнага жыцьця сярод самых Палякоў.

Не капай другому ямку...

КАНКУРЭНЦЫЯ БЕЛАСТОКУ

Радыё «Волга» падало, што ў Берасьці будуецца вялікі ткацкі камбінат «Беларусь», які будзе перарабляць ткацкую сыравіну нашых земляў. Канкурэнцыю гэтую можа адчуць Беласток, будзь што будзь адрэзаны сяньня ад сваіх прыродных базаў сыравіны.

СЛОЎНІКІ

Акадэмія Навукаў БССР выпушчае першы беларускі артаграфічны слоўнік. Рыхтуецца да друку вялікі расейска-беларускі слоўнік (чытай: расейска-расейскі ў беларускай транскрыпцыі зь і ды ў — Рэд.).

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

З адміністрацыі газэты «Бацькаўшчыны» можна выпісаць

КНІЖКІ:

Р. Крушына — **Лебедзь Чорная** (вершы)	1 М.—
С. Юстапчык — **Каханы горад** (проза)	1 М. 50 ф.
А. Радкевіч — **Беларускі лемантар**	2 М.—
І. Г-кі — **Помнікі старажытнасьці** (ратат.)	1 М.—
І. Г-кі — **Малюнкі мінулага** (рататар)	2 М.—
Н. Недасек — **1918—1948**	—.30 ф.
Белая кніга, вып. І.	—.30 ф.
«Сакавік» (часапіс), № 1 (2)	2 М.—

Выйшаў з друку
зборнік вершаў
Алеся Салаўя
СІЛА ГНЕВУ
Цана 1 марка.
Выпісаць можна праз адміністрацыю «Бацькаўшчына».

АДРАСЫ КАМІТЭТАЎ

Падаём адрасы зонных Беларускіх Нацыянальных Камітэтаў, куды трэба зварачацца ўва ўсіх справах эміграцыі, сьцьверджаньня й выпраўленьня нацыянальнае прыналежнасьці, грамадзкага ападаткаваньня й ін.

1. Беларускі Камітэт на Амэрыканскую Зону Нямеччыны (адрыс: Weißruthenisches Komitee, (13b), Osterhofen Ndb).

2. Беларускі Камітэт на Ангельскую Зону Нямеччыны (адрыс: Weißruthenisches Komitee, (23), Oldenburg (Old) Ohmstede Rennplatz, DP-Camp 224-F, Райкой М.).

3. Беларускае Дабрадзейнае Згуртаваньне на Францускую Зону Нямеччыны (адрыс: Weißruthenische Vereinigung, (14b), Saulgau, Kaiserstraße 33, dr. Vojtenka V.).

У пасобных беларускіх лягерах і нацыянальных групах ападаткаваньне будуць спаганяць упаўнаважаныя гэтымі Камітэтамі асобы.

БЕЛАРУСЫ Ў КАНАДЗЕ

могуць атрымаць газэту «Бацькаўшчына» ў спадара Pituška Joseph, General Delivery,
Ottawa Ontario, Canada.
Падпіска каштуе 2 дал. на паўгоду,

Whiteruthenian Weekly „The Fatherland“
Authorized by EUCOM Hq. Civil Affairs Division, 11 March 48, N UNDP 225. Circulation 4000 copies.
Administration — (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian D. P. Camp.
Printed by: Hils & Maier, Dingolfing, Bruckstraße 99.